Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 7 (49) ' 2006

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**М. І. МІНЦКІ — галоўны рэдактар,** *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*

**Заснавальнік і выдавец —**
**Установа «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220004, г. Мінск, вул. Караля, 16; тэл.: 200-02-28 (адк. сакратар),
200-10-73 (аддзел маркетынгу), факс: 200-54-10
e-mail: aiv@aiv.by, http:/www.aiv.by



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

31. ЦНА НАНБ. — Фонд 3. — Оп. 1. — Д. 1036.
32. ЦНА НАНБ. — Фонд 3. — Оп. 1. — Д. 1051.

## Контрольные вопросы

1. Перечислите основные формы международного сотрудничества белорусских историков. Раскройте их сущность. Какие из них вы считаете наиболее интересными и почему?
2. Как вы думаете, почему ученые Беларуси в первую очередь заинтересованы в установлении контактов с коллегами из России, Украины, Польши, Литвы, Германии? Приведите примеры.
3. Какое событие, имевшее большое значение для исторической науки Беларуси, произошло в 1995 г.?
4. В работе каких форумов принимали участие белорусские историки?
5. Подумайте и предложите перспективные направления международного сотрудничества в области исторической науки.

# БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАЕ ПАГАДНЕННЕ АБ ПЕРАСЯЛЕННІ НАСЕЛЬНІЦТВА І ЯГО ВЫНІКІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ (1944–1946)

*Анатоль Вялікі, кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя Максіма Танка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Дадзены артыкул можа быць выкарыстаны як вучэбна-метадычны матэрыял па гісторыі Беларусі ў 11 класе пры вывучэнні тэм «Беларусь у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе», «Беларусь на міжнароднай арэне», а таксама пры асвятленні беларуска-польскіх адносін у першыя пасляваенныя гады.***

Для Беларусі 1944 год стаў адначасова годам вызвалення і выхаду на міжнародную арэну ў якасці паўнаpraўнага ўдзельніка міжнародных адносін. 1 лютага 1944 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон «Аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі народны камісарыят» [1, с. 149]. У адпаведнасці з ім саюзныя рэспублікі атрымалі права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі.

У сакавіку 1944 г. VI сесія Вярхоўнага Савета (ВС) БССР, якая адбылася ў вызваленым ад акупантаў Гомелі, абмеркавала пытанне аб стварэнні саюзна-рэспубліканскіх наркаматаў замежных спраў і абароны. У дакладзе старшыні Прэзідыума ВС БССР Н. Наталевіча падкрэслівалася, што пашырэнне правоў Беларусі ў галіне знешніх зносін з'яўляецца важным крокам у развіцці беларускай дзяржаўнасці; адзначалася вялі-

кае практычнае значэнне выхаду БССР на міжнародную арэну. Н. Наталевіч вызначыў найбліжэйшыя мэты і задачы знешняй палітыкі БССР, якія, у прыватнасці, закраналі ўзаемаадносіны з бліжэйшай заходняй суседкай Беларусі — Польшчай. Кіраўніцтва БССР падкрэслівала, што жадае ўсталявання з ёю дружалюбных і добрасуседскіх адносін, а таксама звярталася да саюзнага кіраўніцтва з просьбай улічыць інтарэсы беларускага народа пры вызначэнні новых межаў паміж СССР і Польшчай [1, с. 150]. Аднак кіраўніцтва Савецкага Саюза мела свае погляды ў пытанні вызначэння савецка-польскай мяжы і не збіралася прыслухоўвацца да беларусаў. 27 ліпеня 1944 г. урад СССР падпісаў з Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення (ПКНВ) часовае пагадненне аб новай савецка-польскай мяжы, у адпаведнасці з якім да Польшчы адыходзіла частка тэрыторыі Беларусі — амаль уся Беласточчына, а пазней, у верасні 1945 г., частка Брэсцкай вобласці: 4 сельсаветы Высокаўскага раёна, г. Гайнаўка і 11 сельсаветаў Гайнаўскага раёна, г. п. Кляшчэлі і 8 сельсаветаў гэтага ж раёна і цалкам Сямяціцкі раён [7, с. 93]. Канчаткова мяжа паміж СССР і Польшчай была замацавана дагаворам аб савецка-польскай дзяржаўнай мяжы, які быў падпісаны 16 жніўня 1945 г. [5, с. 260]. Яе вызначэнне запатрабавала прывядзення ў адпаведнасць з ёю і этнічнай мяжы. Гэта магчыма было зрабіць толькі перасяленнем насельніцтва. Таму 9 верасня 1944 г. старшыня СНК БССР П. Панамарэнка і старшыня ПНКВ Э. Асубка-Мараўскі падпісалі беларуска-польскае пагадненне аб перасяленні польскага насельніцтва, галоўным чынам з заходніх абласцей Беларусі ў Польшчу, і беларускага — пераважна з Беласточчыны — у БССР, якое ажыццяўлялася ў 1944–1946 гг. [6, с. 197–198]. Беларуска-польскае Пагадненне зацвярджала на міжнароднай арэне ў якасці паўнапраўных удзельнікаў сусветных адносін і ПКНВ, і БССР, бо і для Польскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення, і для Беларусі яно з'яўлялася першым міжнародна-прававым актам, з якім лічылася міжнародная супольнасць.

Пагадненне ад 9 верасня 1944 г. прадугледжвала, што «абодва бакі, якія дамаўляюцца, абавязуюцца па яго падпісанні пачаць эвакуацыю ўсіх грамадзян беларускай, украінскай, рускай нацыянальнасцей, пражываючых у Беластоцкім, Аўгустоўскім, Сакольскім, Шчучынскім, Ломжынскім, Высока-Мазавецкім, Бельскім, Бяла-Падляскім паветах і іншых раёнах Польшчы, дзе могуць апынуцца грамадзяне беларускай, украінскай, рускай, русінскай нацыянальнасцей, якія пажадаюць перасяліцца з тэрыторыі Польшчы ў Беларусь, і прыступіць да эвакуацыі ўсіх палякаў і яўрэяў, якія знаходзіліся ў польскім грамадзянстве да 17 верасня 1939 г., пражывалі ў заходніх абласцях Беларусі і жадалі перасяліцца на тэрыторыю Польшчы» [4, арк. 1].

У Пагадненне ўваходзілі 3 раздзелы, якія ўключалі 22 артыкулы. У першым раздзеле (6 артыкулаў) вызначаліся нацыянальнасць, пачатак і заканчэнне перасялення, ільготы, якія атрымлівалі перасяленцы, колькасць рухомай маёмасці, што дазвалялася браць з сабой, а таксама забароненая да вывазу маёмасць, транспартныя расходы, памеры кампенсацыі за пакінутую рухомую і нерухомую маёмасць. Другі раздзел утрымліваў 5 артыкулаў, якія вызначалі работнікаў, што займаліся перасяленнем, іх службовыя абавязкі, правы. Агульнае кіраўніцтва перасяленнем ускладвалася на Галоўнага ўпаўнаважанага Польшчы і Галоўнага прадстаўніка СНК БССР, а таксама на іх прадстаўнікоў на месцах. Трэці раздзел уключаў 11 артыкулаў, якія рэгламентавалі працу па ўліку, рэгістрацыі і перасяленні, вызначалі кола грамадзян, якія мелі на яго права, колькасць і месцазнаходжанне кантрольна-прапускных пунктаў (КПП), праходжанне транспарту і г. д. [4, арк. 1–11]. Упаўнаважаныя і прадстаўнікі бакоў складалі спісы асоб, якія жадалі перасяліцца. Яны павінны былі абвясціць праз друк і мясцовыя органы ўлады ўмовы перасялення, прымалі і афармлялі заявы ад жадаючых.

У Пагадненне неаднаразова ўносіліся дапаўненні і змяненні. Гэта тлумачыцца тым, што і ўрад Беларусі, і ўрад Польшчы дапусцілі шэраг сур'ёзных

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

пралікаў пры яго падрыхтоўцы, што і абумоўлівала неабходнасць унясення паправак. Так, Пагадненне ад 9 верас-

тва, якія таксама пажадалі выехаць у Польшчу. У час перасялення выявілася сукупнасць фактараў, галоўнымі з якіх

ня 1944 г. прадугледжвала, што перасяленне павінна было пачацца 15 кастрычніка 1944 г. і скончыцца 1 лютага 1945 г. Аднак масавая рэгістрацыя палякаў на выезд у студзені — красавіку 1945 г. паказала: ні польскія, ні беларускія ўлады не спрагназавалі, што намер перасяліцца ў Польшчу выкажуць дзесяткі тысяч палякаў. У студзені 1945 г. стала відавочным, што ў вызначаны тэрмін (да 1 лютага 1945 г.) не ўдасца зарэгістраваць і перасяліць у Польшчу ўсіх жадаючых. З другога боку, польскія ўлады не маглі прыняць ўсіх перасяленцаў з Беларусі. Па ўзаемнай дамоўленасці гэтую акцыю прадоўжылі да 1 мая 1945 г., а затым 25 лістапада 1945 г. у выніку беларуска-польскіх перамоў у Варшаве быў падпісаны дадатковы Пратакол аб падаўжэнні тэрміну перасялення да 15 чэрвеня 1946 г. [1, с. 197–198].

Якія ж былі вынікі перасяленчай акцыі для Беларусі? Сотні тысяч палякаў пажадалі змяніць грамадзянства і выехаць на сталае месца жыхарства ў Польшчу. Агульная колькасць зарэгістраваных па ўсіх заходніх абласцях склала 535 284 чалавекі [3, арк. 27]. У тым ліку: з Гродзенскай вобласці на выезд зарэгістравалася 192 859 чалавек, з Маладзечанскай — 101 241, Баранавіцкай — 99 955, Полацкай — 73 077, Брэсцкай — 46 311, Пінскай — 21 841 [3, арк. 27]. Разам з колькаснымі паказчыкамі вызначыўся сацыяльны, прафесійны, узроставы стан перасяленцаў. Большасць з іх склала аднаасобнае сялянства, якое з-за сацыялістычных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, што пачалі набіраць тэмпы, а таксама непамерных падаткаў, штогадовых дзяржаўных пазык, рэгулярных прымусовых аргнабораў на працу за межы рэспублікі такім чынам выказала недавер савецкай уладзе. Яе нягнуткая, дыскрымінацыйная палітыка ў адносінах да палякаў як нацыянальнай меншасці — прымусовае закрыццё польскамоўных школ, культурна-асветніцкіх устаноў, касцёлаў, рэлігійны пераслед не маглі задаволіць інтэлігенцыю, рабочых, саматужнікаў і іншыя групы польскага насельніц-

былі наступныя: сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, канфесійныя, этнічныя, родначныя і інш. Аднак дамінуючымі неабходна прызнаць першыя два з іх.

Жорсткі адміністрацыйны кантроль за ходам перасялення, распачаты вясною 1945 г., шырокамаштабная агітацыйна-прапагандысцкая кампанія, аслабленне ўздзеяння польскага падполля, устанаўленне ў Польшчы падобнага на існаваўшы ў СССР дзяржаўны лад, добраахвотнае адмаўленне ад перасялення прывялі да таго, што сюды пераехала меншая колькасць ад усіх зарэгістраваных (231 152 чалавекі) [3, арк. 28]. У тым ліку з Гродзенскай вобласці выехала 67 118 чалавек, з Баранавіцкай — 49 778, Маладзечанскай — 42 525, Брэсцкай — 33 064, Полацкай — 22 797, Пінскай — 15 870 [2, арк. 29]. Такім чынам, агульная колькасць выехаўшых з кастрычніка 1944 г. па снежань 1946 г. склала 238 782 чалавекі, ці 45,05 %. Пад уздзеяннем розных фактараў адмовілася ад перасялення 265 088 (ці 52 %) грамадзян. 39 044 (7,29 %) чалавекам было адмоўлена ў выездзе з-за таго, што іх палічылі беларусамі-католікамі, якія не мелі права на перасяленне [3, арк. 28].

Перасяленню беларусаў з Польшчы, пераважна з Беласточчыны, былі ўласцівы свае асаблівасці. Вызначылася сукупнасць сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных, родных, канфесійных фактараў, якія вымушалі беларусаў выязджаць у БССР або заставацца ў Польшчы. Дамінуючымі, у адрозненне ад перасялення палякаў з БССР, неабходна лічыць грамадска-палітычныя. Польскія камуністы, якія прыйшлі да ўлады, былі зацікаўленыя ў поспеху «рэпатрыяцыйнай акцыі» з-за жадання пераўтварэння Польшчы ў аднанацыянальную дзяржаву. Не менш істотнай прычынай, якая вымушала беларусаў выязджаць у БССР, з'яўлялася дзейнасць польскага падполля на Беласточчыне. Кіраўніцтва Беларусі таксама было зацікаўлена ў поспеху гэтай акцыі. Аднак з сярэдзіны 1945 г. стала

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

відавочна, што большасць беларусаў праігнаравала перасяленчую акцыю і адмовілася пераязджаць у Савецкую Беларусь.

Найважнейшымі прычынамі, якія стрымлівалі іх ад гэтага, з'яўляліся наступныя: непрыняцце савецкай улады, савецкага ладу жыцця, «прывязанасць» да сваёй уласнасці і маёмасці, родныя сувязі, адмоўнае стаўленне праваслаўнай царквы да перасялення і інш. У Беларусь пераехала галоўным чынам бяднейшае сялянства, якое не бачыла для сябе перспектыў заставацца ў Польшчы, партыйна-савецкі, прафсаюзны, камсамольскі актыў, актыўныя ўдзельнікі сацыялістычных пераўтварэнняў на Беласточчыне ў 1939–1941 гг., супраць якіх у першую чаргу быў скіраваны тэрор польскага падполля. «Рэпатрыяцыйнай акцыяй» скарысталася ўсяго 8220 гаспадарак з агульнай колькасцю 27 808 чалавек [2, арк. 29]. Гэта азначала, што перасяленне палякаў з заходніх абласцей Беларусі ў Польшчу значна перавысіла колькасць беларусаў, якія перасяліліся ў БССР з Польшчы, і ні якасна, ні колькасна не кампенсавала людскія страты Беларусі.

Перасяленне разарвала трывалыя, родныя, сяброўскія, суседскія сувязі, парушыла векавы лад жыцця, значна змяніла традыцыйную структуру насельніцтва беларуска-польскага памежжа. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці на правабярэжжы колькасць палякаў скарацілася на 25–30 %, а на левабярэжжы — на 15–20 %.

Беларуска-польскае Пагадненне аб перасяленні насельніцтва ад 9 верасня 1944 г. і дадатковы пратакол да яго ад 25 лістапада 1945 г. з'яўляліся адзінымі дакументамі двухбаковага характару, што былі заключаны ўрадам БССР з Польшчай на працягу 1944–1989 гг.

1. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. для студ. фак. міжнар. адносін : у 2 ч. — Ч. 2: Ад канца XVIII ст. да пачатку XXI ст. / У. Е. Снапкоўскі. — Мн. : БДУ, 2004.
2. НАРБ. — Фонд 788. — Воп. 1. — Спр. 22.
3. НАРБ. — Фонд 788. — Воп. 1. — Спр. 23.
4. НАРБ. — Фонд 789. — Воп. 1. — Спр. 4.
5. *Парсаданова, В. С.* Советско-польские отношения в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945. — М. : Наука, 1982.
6. *Снапкоўскі, У.* Савецка-польскія пагадненні аб абмене насельніцтвам 1944–1945, 1957 г. // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : БелЭн, 2001. — Т. 6., кн. 1.
7. Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : БелЭн, 1994. — Т. 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мудрость тысячелетий. — М., 2002.**

*Негодование делает поэтом.*

*Не для школы, а для жизни мы учимся.*

*Незапятнанная репутация прекраснее розы.*

*Незнающие пусть научатся, а знающие вспомнят еще раз.*

*Неизвестную болезнь лечить невозможно.*

*Некоторые лекарства хуже болезней.*